**УДК 930(476) "1991/2019": 94(476–074) "1919/1991"**

# АДЛЮСТРАВАННЕ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ НА АКУПАВАНАЙ ЧАСТЦЫ БЕЛАРУСІ ПАДЧАС ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ (1991 – 2019 гг.).

*С. А. ІСАКАЎ*
*(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)*

*Разглядаюцца этапы вывучэння сучаснай беларускай гістарыяграфіяй праблемы грамадска-палітычнага жыцця падчас польска-савецкай вайны 1919 – 1921 гг. Паказаны пазіцыі і накірункі, з якіх беларускія даследчыкі разглядалі праблему на працягу амаль трох дзесяцігоддзяў. Адзначаецца адна з найбольш сталых асаблівасцяў, якая звязана з рознымі поглядамі на разгляд падзей польска-савецкай вайны.*

***Ключавыя словы:*** *польска-савецкая вайна, гістарыяграфія, манаграфія, дысертацыя, даследчык.*

**Уводзіны.** За апошнія дзесяцігоддзі ў сучаснай айчыннай гістарыяграфіі ўзмацнілася цікавасць да вывучэння грамадска-палітычнага жыцця на працягу ўсёй беларускай гісторыі [1, 2, 3]. Важнае месца ў гэтым кантэксце займае перыяд польска-савецкай вайны і адлюстраванне ў ім грамадска-палітычнага жыцця ў 1919 – 1921 гг. Гэта можна патлумачыць тым, што ён стаў лёсавызначальным у беларускім дзяржаўным будаўніцтве, падчас якога востра стала праблема вызначэння беларускай дзяржаўнасці.

Беларускія гісторыкі савецкага перыяду па аб'ектыўных прычынах не звярталіся да разгляду пытанняў, звязаных з грамадска-палітычным жыццём на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Увага ў асноўным надавалася апісанню баявых дзеянняў. Пры такім падыходзе не стаяла пытанне разгляду становішча зямель, якія былі захоплены палякамі. У другой палове 1980-х гадоў пачала змяняцца палітычная сітуацыя з-за палітыкі "перабудовы". У навуковы ўжытак трапілі новыя дакументы, не даступныя раней навукоўцам.

**Асноўная частка.** Аналіз прац сучасных беларускіх гісторыкаў дазваляе вылучыць наступныя этапы: 1) 1991 – 2000 гг. упершыню пачалі з'яўляцца артыкулы і манаграфіі, якія закраналі праблему грамадска-палітычнага жыцця падчас польска-савецкай вайны. 2) 2000 – 2010 гг. адзначыўся большай зацікаўленнасцю ў вучэнні дадзенай праблемы, што мела вынікам абароненыя кандыдацкія дысертацыі. Падзеі польска-савецкай вайны і грамадска-палітычнага жыцця разглядаюцца ў кантэксце гісторыі Беларусі; 3) 2010 г. – сённяшні час. Падзеі польска-савецкай вайны і грамадска-палітычнага жыцця ў гэты час пачалі разглядацца ў кантэксце развіцця беларускай дзяржаўнасці, з'яўляюцца манаграфіі, якія маюць больш навуковы характар, у адрозненне ад папярэдніх этапаў.

Адным з першых выданняў, якое было прысвечана польска-савецкай вайне, сталі "Нарысы гісторыі Беларусі" ў 2-х частках. У 2-й частцы акадэмік І. Ігнаценка падзеі вясны 1919 – вясны 1920 г. вызначыў як польскую інтэрвенцыю, якая праявілася ў наступленні польскіх войск на тэрыторыю Беларусі, а падзеі вясны – лета 1920 г. – як савецка-польскую вайну з наступленнем Чырвонай Арміі [4, с. 43–47]. Вучоны звярнуў увагу на дзейнасць беларускага нацыянальнага руху і яго дзеячоў. Прыйшоў да высновы, што БНР падтрымлівалі інтэрвенты, а ССРБ падтрымалі шырокія масы насельніцтва. Па-за межамі даследавання засталіся тэмы, звязаныя з дзейнасцю палітычных партый, арганізацый і інш. У працы падзеі польска-савецкай вайны асвятляюцца з пазіцый савецкіх даследчыкаў.

Гэта прагледжваецца і ў працы В. Круталевіча, выдадзенай у 1995 г. [5]. Аўтар з юрыдычнага пункту гледжання звяртаецца да дзяржаўнага стасуса БНР і БССР. У выніку прыходзіць да высновы, што БНР не была дзяржавай і кіравалася з Польшчы, а БССР з'яўлялася сувярэннай дзяржавай з самастоўным кіраваннем.

У працы Л. Казлова і А. Цітова, ёсць адрозненне пры разглядзе падзей польска-савецкай вайны. Дзейнасць як польскіх, так і савецкіх войск на беларускіх землях разглядаецца як акупацыя [6, с. 42]. Погляд гісторыкаў з'яўляўся на той момант новым, аднак супярэчлівым у гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

Пытаннямі беларускага нацыянальнага руху і гісторыі развіцця беарускіх партый і арганізацый у XIX – XXI стст. займаўся І. Коўкель. Ён апублікаваў шэраг артыкулаў, адзін з якіх у зборніку Беларусістыка: "Польска-літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх палітычных партыяў і арганізацыяў (1920–1923 гг.)" [7]. Навуковец разглядае праблему Сярэдняй Літвы, якая з'яўлялася спрэчнай тэрыторыяй у адносінах паміж Польшчай і Літвой. На думку даследчыка, абодва бакі выкарыстоўвалі беларускі нацыянальны рух у сваёй палітыцы як інструмент і пры гэтым не жадалі дапусціць яго кансалідацыі.

Значны ўклад у вывучэнне польска-савецкай вайны і беларускага нацыянальнага руху ўнёс А. Чарнякевіч, які адлюстраваў у шэрагу апублікаваных артыкулаў пытанні палітычнага жыцця падчас польскай акупацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі і ўплыву на яго афіцыйнай польскай палітыкі [8 – 10].

Станоўчым момантам у сучаснай гістарыяграфіі з'яўляецца зварот сучасных гісторыкаў, да маловядомых крыніц. У часопісе "Спадчына" за 1993 г. з'явіўся шэраг артыкулаў А. Луцкевіча, (пад псеўдані-

мамі А. Новіна, І. Мялешка), якія выйшлі пад рэдакцыяй В. Мазеца з уступным словам [11]. Каштоўнасць артыкулаў у тым, што на старонках беларускіх газет адлюстраваны погляд беларускага нацыянальнага лідара, прадстаўніка беларускага нацыянальнага руху на будучы палітычны лёс беларускіх земель і дзяржаўнае будаўніцтва.

У 1998 г. быў выдадзены ў Мінску – Вільні дакументальны зборнік "Архівы БНР" (Т. 1 кнігі 1 [13] і 2 [14]), дзе былі апублікаваны дакументы з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага архіва Літвы ў Вільні па гісторыі беларускага нацыянальнага руху. Гэта было першае выданне, якое сабрала ўсе даступныя матэрыялы па гісторыі БНР, перапіске палітычных дзеячаў, утварэнні і дзейнасці арганізацый і інш.

Да праблемы беларускага нацыянальнага руху падчас польска-савецкай вайны звярнуўся У. Ляхоўскі [12]. Аўтар ахарактарызаваў палітыку польскіх улад як акупацыю, якая была накіравана супраць беларускай культуры, дзе прыводзіў факты негатыўнага ўплыву паланізацыі.

Пытанне дзейнасці беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў на тэрыторыі Беларусі ў 1918 – 1924 гг. разглядае Н. Глушакова [15]. У сваёй працы даследчыца асвятляе дзейнасць, спробы перамоў з польскім і савецкім кіраўніцтвам Беларускай ПС–Р на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Каштоўнасць працы заключаецца ў тым, што даследчыца адна з першых працавала з рассакрэчанымі архіўнымі крыніцамі архіва Камітэта Дзяржаўнай Бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Для першага этапу развіцця беларускай гістарыяграфіі (1991 – 2000 гг.) характэрны паступовы адыход ад догм савецкай гістарычнай навукі і з'яўленне новых поглядаў на праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці [4 – 6], удасканальванне навуковага тэрміналагічнага апарата.

На другім этапе развіцця беларускай сучаснай гістарыяграфіі (2000 – 2010 гг.) па праблеме грамадска-палітычнага жыцця працягнулася вывучэнне пытанняў, звязаных з беларускім нацыянальным рухам. З'яўляюцца першыя манаграфіі, якія больш грунтоўна разглядаюць дадзенае пытанне.

У. Ладысеў у 2003 г. апублікаваў манаграфію "Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.)" [16]. Даследчыка можна аднесці да савецкай гістарычнай школы, бо ён працягнуў традыцыю вызначэння польска-савецкага ваеннага канфлікту як польскай інтэрвенцыі. Спрэчным пытаннем з'яўляецца пададзеная інфармацыя наконт Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх Зямель, дзе адзначалася што: "Павятовымі старастамі прынцыпова назначаліся памешчыкі, войтамі ў гмінах – выключна палякі і каталікі" [16, с. 119]. Аднак, да гэтага патрэбна адносіцца крытычна, бо не заўсёды павятовымі камісарамі назначаліся палякі, што датычылася і пасады войта [17].

У гэты перыяд надрукавана калектыўная манаграфія "Гісторыя Беларусі ў шасці тамах", дзе часткова разглядаюцца падзеі польска-савецкай вайны 1919 – 1921 гг. У пятым томе (Беларусь у 1917 – 1945 гг.) [1] пазначанай праблеме прысвечана глава 2 – раздзелы пра інтэрвенцыю Польшчы і Беларусь у польска-савецкай вайне, у 3-й главе – раздзелы, якія датычыліся абвяшчэння БНР – пад аўтарствам акадэміка І. Ігнаценка. Раздзелам аб знешнепалітычнай дзейнасці займаўся У. Снапкоўскі, главу "Рыжскі мір і падзел Беларусі" адлюстраваў С. Траццяк. Пазіцыя І. Ігнаценкі па праблеме даследавання адпавядала яго папярэднім поглядам, выкладзеным у "Нарысах гісторыі Беларусі" [4]. С. Траццяк звярнуўся да разгляду дзейнасці беларускай палітычнай эміграцыі на тэрыторыі іншых дзяржаў. Гэтая праблема ў беларускай гістарыяграфіі паўстала ўпершыню. Манаграфія змяшчае ў сабе савецкія і сучасныя беларускія погляды на гісторыю польска-савецкай вайны на прыкладзе І. Ігнаценкі і С. Траццяка.

У гэты час у 6-м томе Энцыклапедыі Гісторыі Беларусі з'явіўся артыкул М. Сташкевіча "Савецка–польская вайна 1920" [18, с. 195–197]. Даследчык вылучыў 2 этапы польска-савецкай вайны. Першы этап вайны вызначаўся як наступальны, з боку Польшчы ў 1919–1920 гг., а другі этап савецка-польскай вайны звязаны з наступленнем Чырвонай Арміі летам 1920 г. і падпісаннем у далейшым Рыжскага мірнага дагавору.

Праблеме беларускай дзяржаўнасці сваю працу прысвяціў А. Райчонак "Станаўленне Беларускай дзяржаўнасці ў кантэксце розных ідэалогій і прыярытэтаў (1917–1927 гг.)" [19]. Аўтар аналізуе палітычную сітуацыю на тэрыторыі Беларусі ў 1917 – 1927 гг., параўноўвае беларускія партыі і арганізацыі падчас польска-савецкай вайны. У выніку чаго прыйшоў да высновы, што Польшча апелявала да міжнароднай супольнасці пра парушэнне права нацый на самавызначэнне наконт сябе, аднак не збіралася выконваць гэтае права ў адносінах да суседніх народаў.

У сваім гістарыяграфічным даследаванні Т. Тахіян, прывяла аналіз вывучэння пытання беларускай дзяржаўнасці ў 1917–1922 гг. па даступных на той момант манаграфіях, брашурах, успамінах і інш. У працы пададзена інфармацыя аб даследчыках, якія займаліся праблемай вывучэння БНР. Т. Тахіян прыйшла да высновы, што большасць гісторыкаў разглядаюць дзейнасць БНР як пачатковы этап беларускай дзяржаўнасці ў XX ст. [20].

Найбольш поўна адлюстроўвае грамадска-палітычнае жыццё на акупаваных беларускіх землях у перыяд польска-савецкай вайны (люты 1919 – сакавік 1921 года) праца А. Чарнякевіча [21]. На падставе

архіўных матэрыялаў аўтар разгледзеў структуру і асноўныя этапы фарміравання польскай адміністрацыі на акупаванай тэрыторыі, звярнуўшы асаблівую ўвагу на фарміраванне польскай ваеннай і грамадзянскай адміністрацыі, правёў аналіз дзейнасці органаў самакіравання, Грамадзянскага Упраўлення Усходніх Зямель і таварыства Стражы Крэсовай. Акрамя дысертацыі, навуковец апублікаваў шэраг артыкулаў, якія закранаюць розныя аспекты грамадска-палітычнага жыцця 1919 – 1921 гг. і інш. [22 – 24].

Міжнародную дзейнасць урада БНР у 1918 – 1920 гг. разглядае ў сваёй працы Т. Паўлава [25]. Таксама закранаюцца пытанні вызначэння дзяржаўных меж БНР, памер яе тэрыторыі і ўмовы міжнароднага прызнання. Аўтар разглядае супрацоўніцтва беларускіх партый і арганізацый з акупацыйнай польскай уладай, перамовы беларускіх палітычных дзеячоў з кіраўнікамі УНР па пытаннях акрэслення меж, перамовы А. Луцкевіча з кіраўнікамі краін Антанты і спробы паслання беларускімі арганізацыямі дэлегацый у Лігу Нацый.

А. Гецевіч [26] зрабіў аналіз дзейнасці асноўных польскіх партый, якія мелі дачыненне да акупаванай тэрыторыі Беларусі. Аўтар у асноўным звярнуў увагу на дзейнасць Польскай Партыі Сацыялістаў і нацыянал-дэмакратычнай партыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У працы параўноўваецца стаўленне партый да беларускіх зямель, разглядаюцца канцэпцыі ўваходжання беларускіх зямель у склад Рэчы Паспалітай Польскай.

Да пытання ўзаемаадносін беларускіх і ўкраінскіх арганізацый звярнуўся А. Кукса ў даследаванні: “Беларускія і ўкраінскія арганізацыі: ўзаемадзеянне і тактыка в перыяд станаўлення дзяржаўнасці ў Беларусі і Украіне (люты 1917 – снежань 1922 гг.)” [27]. Даследчык разглядае ход падзей пасля падпісання Брэсцкага мірнага дагавору, адлюстроўвае ход перамоў паміж дэлегацыяй БНР і УНР, разглядае стаўленне беларускіх партый да перамоў з украінскім урадам. У працы праведзены аналіз падзей польска-савецкай вайны і стаўленне ўкраінскіх, і беларускіх арганізацый да польскай улады і войска. Польскія палітыкі па рознаму адносіліся да беларускіх і ўкраінскіх зямель, што вызначала правядзенне рознай палітыкі ў адносінах да гэтых зямель.

У сваім даследаванні П. Стецкевіч закрануў праблему стварэння і дзейнасці яўрэйскіх партый і арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі [28], прааналізаваў іх дзейнасць падчас польска-савецкай вайны. Шматлікія яўрэйскія партыі спынілі сваю палітычную дзейнасць па прычыне рэпрэсій з боку кіраўніцтва абедзвюх дзяржаў. Да сённяшняга часу гэтая праца з’яўляецца адзіным даследаваннем па вывучэнні дзейнасці яўрэскіх партый і арганізацый падчас польска-савецкай вайны.

Праблему, звязаную з этнапалітычным пытаннем, у сваёй працы закранула В. Рабышка [29]. Яна звярнулася да палітычных пытанняў, у рэчышчы якіх разгледзела нацыянальнае. На падставе статыстычных даных і перапісаў даецца аналіз нацыянальнага складу насельніцтва Заходняй Беларусі 1919 – 1921 гг. В. Рабышка прыйшла да высновы, што палітыка польскіх улад, пачынаючы з 1919 г., была скіравана на апалячванне мясцовае насельніцтва. Усё гэта адпавядала праграме “інкарпарацыі”, якая рэалізоўвалася праз выкарыстанне школы, царквы і войска. Даследчыца зрабіла крытычны аналіз праведзеных падчас польска-савецкай вайны перапісаў і статыстычных даных, канстатуючы пераважную колькасць палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Падчас другога этапа развіцця беларускай гістарыяграфіі па тэме артыкула большасць даследчыкаў звярнулася да разгляду польскай палітыкі ў дачыненні да беларускіх зямель [19, 26, 27, 22], а таксама дзейнасці польскіх, беларускіх, украінскіх і яўрэйскіх палітычных партый і арганізацый [27, 28].

Трэці этап, як пазначалася вышэй, пачаўся з 2010 г. Для яго характэрна з’яўленне манаграфій, прысвечаных беларускай дзяржаўнасці, правядзенне канферэнцый і выхад работ, прысвечаных юбілейным датам: 90-годдзе падпісання Рыжскага міру, 100-годдзе абвяшчэння БНР, 100-годдзе стварэння ССРБ і інш. Першым выданнем ў гэты перыяд стала калектыўная манаграфія “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.”, дзе ў першай кнізе разглядалася тэма польска-савецкай вайны, аднак у кантэксце толькі савецкай часткі Беларусі. У 5-м раздзеле “Беларуская дзяржаўнасць: формы самавызначэння і развіцця (1917 – 1939 гг.) [2] падаюцца падзеі, звязаныя з БНР (В. Мазец і М. Сташкевіч) і стварэнне ЛітБела (С. Хоміч), другое абвяшчэнне ССРБ і баявыя дзеянні падчас польска-савецкай вайны (У. Ладысеў). Незакранутымі засталіся пытанні, звязаныя з палітычнай дзейнасцю на тэрыторыі Беларусі арганізацый, гурткоў і інш.

У 2012 г. выдавецтва “Кнігазбор” выпусціла кнігу “Анатоль Грыцкевіч. Выбранае”, дзе змяшчаліся артыкулы даследчыка. У кнізе быў надрукаваны раздзел “Барацьба за Беларусь 1917–1921” [30], які быў прысвечаны баявым дзеянням і разгляду грамадска-палітычнага жыцця ў гады польска-савецкай вайны, аналізавалася дзейнасць беларускіх партый і арганізацый, стаўленне іх да польскай акупацыйнай улады і спробы кансалідацыі беларускага нацыянальнага руху.

Праблемамі беларускага нацыянальнага руху працягвае займацца А. Чарнякевіч, які напісаў некалькі навукова-папулярных кніг: “Чужы сярод чужых” [31], біяграфічнае выданне пра прадстаўніка “паланафілаў” у нацыянальным руху, П. Аляксюка, “БНР триумф побежденных” [32] – аб дзейнасці

урадавых структур БНР у 1918–1925 гг., і “Нараджэнне Беларускай Гародні” [33] – пра развіццё беларускага нацыянальнага руху ў Гродна.

Палітыку ў сферы адукацыі падчас польска-савецкай вайны вывучае А. Трубчык [34]. У працы разглядаецца важны аспект, які тычыцца нацыянальнага школьніцтва ў сістэме Грамадзянскага Упраўлення Усходніх Зямель (ГУУЗ), звязаны з адносінамі беларускіх арганізацый і польскім кіраўніцтвам на акупаванай тэрыторыі. Аўтар займаецца пытаннямі дзейнасці польскай адміністрацыі і прысвяціла гэтаму шэраг артыкулаў [35, 36 і інш].

Маладзёвы рух падчас польска-савецкай вайны закрануў у манаграфіі “Ад гоманцаў да гайсакоў” У. Ляхоўскі [37]. Аўтар прасачыў развіццё маладзёвага руху падчас польска-савецкай вайны праз адпаведныя арганізацыі, што дзейнічалі ў той час. Даследчык адзначыў асаблівасці маладзёвых арганізацый на тэрыторыі Слуцкага павета. Выданне з’яўляецца навукова-папулярным, аднак распавядае пра дзейнасць гуртка “Папараць-кветка”, які функцыянаваў падчас польска-савецкай вайны 1919–1921 гг.

У гэты час з’явілася калектыўная манаграфія “Рижский мир в судьбе белорусского народа 1921–1953 гг.” Істытута гісторыі НАН Беларусі. У кнізе першай разгледжаны падзеі польска-савецкай вайны. У 2-м (“Польска-савецкая вайна і Беларусь”) і 3-м (“Беларускае пытанне на савецка-польскіх мірных перамовах 1920–1921 гг”) раздзелах [38] увага скіравана на палітычныя пытанняі на акупаванай тэрыторыі Беларусі падчас вайны.

Праблематычную тэму савецка-польскіх перамоў закранае В. Бароўская, якая падрыхтавала манаграфію “Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918 – 1921 гг.” [39]. Па гэтай жа тэме абараніла кандыдацкую дысертацыю [40]. Даследчыца на падставе архіўных матэрыялаў, прааналізавала этапы і ход перамоў паміж польскім і савецкім бокам, упершыню падняла пытанне ролі Беларусі на розных этапах Рыжскіх перамоў. Акрамя таго, даследчыца вывучае палітычныя пытанні, канцэпцыі і праблемы, звязаныя з польска-савецкай вайной [41 – 43].

Пытанне адносін Польшчы з Савецкай Расіяй у гістарыяграфічным кантэксце разгледзеў у сваёй працы М. Мязга [44]. Даследчык прааналізаў міжваенную гістарыяграфію польска-савецкіх узаемаадносін, і зрабіў высновы па працах польскіх і савецкіх палітычных дзеячаў і палітыкаў. У польскай гістарыяграфіі даследчык вылучыў два лагеры: “федэралізма” і “інкарпарацыі”, якія ў асноўным і аказвалі ціск на развіццё гістарыяграфіі міжваеннага перыяду. Гэта ж датычыцца і савецкай гістарыяграфіі.

У манаграфіі У. Снапкоўскага “Шлях скрозь стагоддзе: беларуска–польскія адносіны 1918–2017 гг.” [45] аўтар разгледзеў этапы ўзаемаадносін польскага і беларускага народа. У раздзеле аб падзеях 1919–1921 гг. прыйшоў да высновы, што ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі трэба адыходзіць ад савецкіх догм, якія тычацца тэрмінаў “інтэрвенцыі” і “акупацыі” беларускіх зямель падчас польска-савецкай вайны. Аднак востра паўстае пытанне, як ставіцца да палітыкі польскіх улад і войска на тэрыторыі Беларусі з-за пастаянных рэквізіцый і гвалту.

Адметнай падзеяй у сучаснай гістарыяграфіі стала калектыўнае выданне “История белорусской государственности” у 5-і тамах. Трэці том мае назву “Белорусская государственность: от идеи к национальному государству (1917–1939 гг.)”. Вучоныя з прыцягненнем шэрокага кола матэрыялаў даследавалі перыяд польска-савецкай вайны. Даследчыкі С. Хоміч і В. Бароўская далі апісанне ходу вайны і палітычнай сітуацыі, якая склалася на беларускіх землях, адлюставалі ход і ўмовы падпісання Рыжскага міру. Іншую акалічнасць закранулі В. Даніловіч, В. Крывуць і А. Горны, якія ў 4 главе прааналізавалі грамадска-палітычнае жыццё Заходняй Беларусі праз прызму развіцця польскіх, яўрэйскіх і інш. партый [3]. Аднак у кнізе было абмінута грамадска-палітычнае жыццё на акупаваных тэрыторыях Беларусі, у выніку гэты прабел застаўся да сённяшняга часу.

**Заключэнне.** Такім чынам, аналіз гістарыяграфіі па тэме артыкула дазваляе вылучыць тры этапы.

Першаму этапу (1991 – 2000 гг.) былі характэрны адыходжанні ад савецкай гістарыяграфіі (апісання баявых дзеянняў) і пераход да вызначэння перадумоў і асмыслення падзей у гістарычным значэнні. З атрыманнем рэспублікай незалежнасці змянілася гістарычная канцэпцыя, якая пачала глядзець на існаванне БНР як на адзін з этапаў беларускай дзяржаўнасці. Большасць матэрыялаў па дадзенай праблематыцы змяшчалася на старонках часопісаў, выйшла некалькі выданняў, прысвечаных падзеям польска-савецкай вайны, абаронена кандыдацкая дысертацыя. Тым не менш, некаторыя гісторыкі засталіся на савецкіх пазіцыях пры разглядванні гэтага пытання.

На другім этапе (2000 – 2010 гг.) даследчыкі звярнуліся да разгляду палітычных пытанняў, дзе галоўнае месца займаў аналіз канцэпцый, партый і арганізацый польскага, беларускага і іншых рухаў. Адзначаецца большая зацікаўленнасць у вывучэнні падзей польска-савецкай вайны, якая выявілася ў абароне 10 кандыдацкіх дысертацый, з’яўленні калектыўнай манаграфіі “Гісторыя Беларусі ў шасці тамах”. У пятым томе раздзел быў прысвечаны польска-савецкай вайне. Асаблівасць гэтага выдання ў тым, што там прадстаўлены не толькі погляд “савецкіх гісторыкаў”, але і беларускіх.

Трэці этап (2010 г. – сённяшні час) прысвечаны вывучэнню і асэнсаванню палітыкі Польшчы ў адносінах да беларускіх зямель, месцу і ролі польскіх урадавых структур ва ўзаемаадносінах з беларускім

нацыянальным рухам, дзеячамі і інш. За перыяд 2010 – 2019 гг. па тэме было абаронена 2 кандыдацкія і доктарская дысертацыя. Даследчыкі сталі адыходзіць ад абагульняльных прац і заняліся выданнем аўтарскіх манаграфій, дзе больш грунтоўна разглядаецца адзін з аспектаў праблемы.

Разгляд беларускай гістарыяграфіі паказвае, што негледзячы на напісаныя манаграфіі, абароненыя дысертацыі і інш., тэма грамадска-палітычнага жыцця падчас вайны застаецца мала даследаванай. На гэта ёсць шэраг акалічнасцей, адна з якіх, – аднабаковае стаўленне гісторыкаў да польска-савецкай вайны. Яно праяўляецца ў займанні савецкай пазіцыі або польскай. Да сённяшняга часу не вызначана, як ставіцца да праблемы існавання БНР падчас польска-савецкай вайны, як да ўрада якім кіравала Польшча, або не. Беларускія гісторыкі не прышлі да адзінага погляду, як вызначаць вайну 1919–1921 гг. савецка–польскую або польска–савецкую. Для садзейнічання аб’ектыўнаму разгляду падзей, на нашу думку, трэбна расправаць адзіную канцэпцыю і весці супрацоўніцтва з польскімі гісторыкамі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал. А. Вабішчэвіч [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2013 / рэдкал.: М. Касцюк. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. – 2007. – 613 с.

2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – Кн. 1. – 584 с.

3. История белорусской государственности : в 5 т. – Т. 3.: Белорусская государственность: от идеи к национальному государству (1917–1939 гг.) / А.А. Коваленя [и др.] ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин–т истории. – Минск : Беларуская навука, 2019. – 639 с.

4. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. – Ч. 2. / М. П. Касцюк [і інш.] ; Ін-т гісторыі АНБ. – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.

5. Круталевич, В. А. На путях национального самоопределения БНР–БССР–РБ / В. А. Круталевич. – Минск : Право и Экономика, 1995. – 138 с.

6. Казлоў, Л. Р. Беларусь на сямі рубяжах / Л. Р. Казлоў, А. К. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 1993. – 71 с.

7. Коўкель, І. Польска–літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх палітычных партыяў і арганізацыяў (1920–1923 гг.) / І. Коўкель // Беларусіка. – 1994. – Кн. 3. – С. 259–269.

8. Чарнякевіч, А. Гарадзенскія апосталы. Беларускі нацыянальны рух у Гродна ў 1918–1920 гг. / А. Чарнякевіч. – Гродна : Грамадскае аб'яднанне "Ратуша", 1999. – 82 с.

9. Чернякевич, А. Н. Гродно. 19–23 июля 1920 года / А. Н. Чернякевич // Шлях у навуку: матэрыялы 7-й рэсп. нав.-практ. канф., прысв. 40-годдзю студэнцкага нав.-краязн. гуртка Гродз. Дзярж. ун-та імя Я. Купалы. – Мінск : БелНДІДАС, 1996. – С. 187–191.

10. Чернякевич, А. К истории установления польской власти в Бресте / А. Чернякевич // Берасцейскі хранограф : зб. нав. пр.– Брэст : Выдавецтва С. Лаўрова, 1999. – Вып. 2. – С. 101–107.

11. Мазец, В. Публіцыстыка з часоў БНР / В. Мазец // Спадчына. – 1993. – №3. – С. 11 – 15.

12. Ляхоўскі, У. Беларуская справа пад час польскай акупацыі 1919–1920 г. / У. Ляхоўскі // Спадчына. – 1994. – № 6. – С. 50 – 87.

13. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі : у 2 кн.: склад. С. Шупа. – Вільня; Нью–Ёрк; Менск; Прага, 1998. – Ч. 1 : 1917–1920. – 870 с.

14. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі : у 2 кн.: склад. С. Шупа. – Вільня; Нью–Ёрк; Менск; Прага, 1998. – Ч. 2 : 1920–1925. – 871 – 1721 с.

15. Глушакова, Н. А. Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў: станаўленне і палітычная дзейнасць (1918 – 1924) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Н. А. Глушакова ; Бел. дзярж ун-т. – Мінск, 1999. – 22 с.

16. Ладысеў, У. Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў. П. І. Брыгадзін. – Мінск : БДУ, 2003. – 307 с.

17. Gierowska-Kałłaur, J. Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (19 lutego –9 września 1920) / J. Gierowska-Kałłaur. – Warszawa : Neriton, Institut Historii PAN, 2003. – 431 s.

18. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Т. 6. Кніга 1: Пузыны – Усая / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – 591 с.

19. Райчонак, А. А. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці ў кантэксце розных ідэалагічных прыярытэтаў (1917–1927 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. Навук : 07.00.02 / А. А. Райчонак ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2004. – 20 с.

20. Тохиян, Т. М. Становление белорусской государственности в 1917 – 1922 гг. в оценке отечественной историографии : автореф. дисс. … канд. ист. наук : 07.00.09 / Т. М. Тохиян ; Бел. гос. ун-т. – Мінск, 2007. – 21 с.

21. Чернякевич, А. Политика Польши на оккупированной территории Беларуси в период польско-советской войны (февраль 1919 – март 1921 года) : автореф. дисс. … канд. ист. наук : 07.00.02 / А. Чернякевич ; Бел. гос. ун-т. – Минск, 2001. – 22 с.

22. Чернякевич, А. Конфессиональная политика польских властей на оккупированной территории Беларуси в 1919–1920 г.г. / А. Чернякевич // Работа з адоранай студэнцкай і вучнёўскай моладзю: стан, формы і метады, перспектывы развіцця : матэрыялы рэсп. нав.-практ. канф. ; ГрГУ им. Я. Купалы. – Гродно : ГрГУ, 2001. – С. 315–321.

23. Чарнякевіч, А. Да гісторыі фармавання паланафільскага крыла ў беларускім нацыянальным руху летам 1919 года / А. Чарнякевіч // Подготовка педагогических и научных кадров историков и развитие исторической науки в Беларуси : материалы респ. науч.-практ. конф., 30 сент. 2004 г., Гродно / Под ред. Е.А.Ровбы. – Гродно : ГрГУ, 2005. – С. 355–361.

24. Чернякевич, А. Гродненская еврейская община в годы польско–советской войны 1919–1920 гг. / А. Чернякевич // Евреи Беларуси: История и культура: сб. науч. тр. – Минск : Четыре четверти, 2001. – Вып. 6 / Сост.– ред. И. Герасимова. – С. 96–111.

25. Павлова, Т. Я. Внешнеполитическая деятельность Белорусской Народной Республики в 1918–1920 гг. : автореф. дисс. … канд. ист. наук : 07.00.15 / Т. Я. Павлова ; Бел. гос. ун-т. – Минск, 2001. – 20 с.

26. Гецевич, А. К. Деятельность польских политических партий и организаций в Западной Беларуси (1918 – 1926 гг.) : автореф. дисс. … канд. ист. наук : 07.00.02 / А. К. Гецевич ; Бел. гос. ун-т. – Минск, 2006. – 21 с.

27. Кукса, А. Н. Белорусские и украинские общественно-политические организации : взаимодействие и тактика в период становления государственности в Беларуси и Украине (февраль 1917 – декабрь 1922 гг.) : автореф. дисс. … канд. ист. наук : 07.00.02 / А. Н. Кукса ; Бел. гос. ун-т им. М. Танка. – Минск, 2007. – 23 с.

28. Стецкевич, П. Т. Деятельность еврейских политических партий и организаций на территории Западной Беларуси (1918–1926 гг.) : автореф. дисс. … канд. ист. наук : 07.00.02 / П. Т. Стецкевич ; Ин-т истории НАН Беларуси. – Минско, 2008. – 23 с.

29. Рабышка, В. Э. Этнапалітычныя працэсы ў Заходняй Беларусі ў 1919 – 1939 гадах : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / В. Э. Рабышка ; Бел. пед. ун-т імя М. Танка. – Мінск, 2004. – 22 с.

30. Грыцкевіч, А. Барацьба за Беларусь 1917–1921 / А. Грыцкевіч // Выбранае. – Мінск : Кнігазбор, 2012. – 608 с.

31. Чарнякевіч, А. Чужы сярод чужых / А. Чарнякевіч. – Мінск : Выдавец А.М. Янушкевіч, 2017. – 317 с.

32. Чернякевич, А. БНР триумф побежденных / А. Чернякевич. – Минск : Издатель А.Н. Янушкевич, 2018. – 302 с.

33. Чарнякевіч, А. Нараджэнне беларускай Гародні / А. Чарнякевіч. – Мінск : Выдавец А.М. Янушкевіч, 2015. – 172 с.

34. Трубчык, А. Г. Палітыка польскай улады ў сферы школьнай адукацыі на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1919–1921 гг. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. Г. Трубчык ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2017. – 23 с.

35. Трубчык, А. Г. Асноўныя кірункі і асаблівасці дзейнасці польскай грамадзянскай адміністрацыі на беларускай тэрыторыі ў час польска-савецкай вайны (1919–1921 гг.) / А. Г. Трубчык // Материалы Респ. науч. конф., Барановичи, 21 апр. 2016 г. / М-во образования Респ. Беларусь, Баранович. гос. ун–т ; редкол.: А. В. Никишова [и др.]. – Барановичи : РИО БарГУ, 2016. – С. 62–66.

36. Трубчык, А. Асноўныя накірункі адукацыйнай палітыкі на беларускай тэрыторыі Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх зямель / А. Трубчык // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2012. – № 37. – С. 70–90.

37. Ляхоўскі, У. В. Ад гоманцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX – 1-й палове XX ст. ( да 1939 г.) / У.В. Ляхоўскі. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 479 с.

38. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. : в 2 кн. / А. А. Коваленя [и др. ] ; Нац. Акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Кн. 1. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 593 с.

39. Бароўская, В. М. Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. / В. М. Бароўская ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2015. – 23 с.

40. Бароўская, В. М. Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. / В. М. Бароўская. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 269 с.

41. Бароўская, В. М. Плебісцыт як форма вырашэння спрэчных пытанняў падчас польска-савецкіх перагавораў 1919 – 1921 гг. / В. М. Бароўская // Науч. тр. Респ. ин-та высшей школы. – 2013. – С. 22–28.

42. Бароўская, В. Інстытут інструктарства на акупіраваных польскімі войскамі беларускіх землях у 1919–1920 гг. / В. Бароўская // Сб. работ 68-й науч. конф. студентов и аспирантов Белгосуниверситета : в 3 ч., Минск, 11 мая 2011 г. / Бел. гос. ун–т ; редколл.: И. А. Фурманов [и др.]. – Минск : БГУ, 2011. – Ч. 3. – С. 133–136.

43. Бароўская, В. М. Эвалюцыя ідэі краёвасці на тэрыторыі Беларусі ў 1918–1921 гадах. / В. М. Бароўская // Беларуская думка. – 2018. – № 9. – С. 88–93.

44. Мезга, Н. Н. Советско-польские отношения в советской и польской историографии 1918 – 1941 гг. : автореф. дис. .. д-ра ист. наук : 07.00.09 / Н. Н. Мезга ; Бел. гос. ун-т. – Минск, 2016. – 46 с.

45. Снапкоўскі, У. Е. Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918–2017 гг. / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск : БДУ, 2017. – 285 с.

*Паступіў 11.12.2019*

**REFLECTION OF SOCIAL AND POLITICAL LIFE IN THE OCCUPIED PART OF BELARUS DURING THE POLISH–SOVIET WAR IN MODERN BELARUSIAN HISTIRIOGRAPCHY (1991–2019).**

***S. ISAKAU***

*The stages of the formation of modern Belarusian historiography on the problem of studying social and political life during the Polish–Soviet war of 1919–1921 are considered. Shown are the positions and directions from which Belarusian researchers considered the problem for almost three decades. One of the most permanent features is noted, which is associated with a different view of the events of the Polish–Soviet war.*

***Keywords:*** *Polish–Soviet war, historiography, social and political life.*